Госпадзе Ісусе,
Ты перад нашымі вачыма ў абліччы дзіцяці,
і мы верым, што Ты Сын Божы, які стаў чалавекам
праз Духа Святога ва ўлонні Панны Марыі.
Гэтаксама як у Віфлееме і мы, разам з Марыяй і
Язэпам, анёламі і пастухамі, схіляемся перад Табой і
вызнаем, што Ты наш адзіны Збаўца.
Ты стаў бедным, каб мы ўзбагацелі Тваёй беднатой;
зрабі так, каб мы ніколі не забываліся пра бедных і тых,
хто цярпіць.

Барані нашыя сем'і,
добраслаўляй усіх дзяцей усяго свету і зрабі так,
каб над намі заўсёды панавала любоў, якую Ты прынёс,
і каб учыніла нашае жыццё шчаслівейшым.
Зрабі так, Ісусе, каб людзі спасцігл і знак Божага
нараджэння, каб зразумелі, што Ты прыйшоў
падарыць усёй чалавечай сям'і святло, радасць і
спакой.
Бо Ты ёсць Бог, Ты жывеш і валадарыш з Богам Айцом
у еднасці Духа Святога на вякі вечныя.

Амін.

Малітва папы Бенедыкта XVI
прамоўленая пры наведванні
Храма Маці Божай Пераможнай
26 верасня 2009 года.

BLR

МАЛІТВА
вялебнага айца Кірылы ад Маці Божай
босага кармеліта (1590—1675)

Дзіцятка Ісусе (Езу), спяшаюся да Цябе і на просьбу
Маці Тваёй,
найсвяцейшай Панны Марыі, малю Цябе,
дапамажы мне ў маёй патрэбе (можна назваць),
бо глыбока веру, што можаш мне дапамагчы.
Я цвёрда ўпэўнены, што атрымаю Тваю святую ласку.
Люблю Цябе ўсім сваім сэрцам і з усіх сілаў сваёй
душы.
Шчыра каюся за ўсе свае грахі і прашу Цябе,
добры Ісусе (Езу), каб Ты даў мне сілы іх пераадолець.
Прысягаю, што ніколі не пакрыўджу Цябе, аддаюся ў
рукі Твае
і лепш буду цярпець, чым зраблю Табе балюча.
Адгэтуль хачу верна служыць Табе і праз любоў да
Цябе
хачу любіць і бліжняга як самога сябе.
Усемагутнае Дзіця, Госпадзе Ісусе (Пане Езу), зноў
прашу Цябе
дапамагчы мне ў маім клопаце (можна назваць).
Дай мне ласку, каб я навек з Табой уз'яднаўся разам з
Марыяй і Язэпам
і каб пакланяўся Табе разам з анёламі ў высях
нябесных.

Амін.